■ Спецыяльны рэпартаж

ПАКАРАННЕ ЗА ДАВЕРЛІВАСЦЬ?

Карэспандэнты «Звязды» прымералі на сябе ролю кватэрных ашуканцаў

Кожны год ахвярамі падманшчыкаў усё часцей становяцца пажылыя людзі. Здавалася б, пенсіянеры — самая вопытная і мудрая частка насельніцтва, якая не лянуецца лішні раз усё праверыць і, дзе трэба, падстрахавацца. Але на практыцы часта ўсё выглядае па-іншаму. Да таго ж часта злачынцаў у дом пускаюць самі пацярпелыя. Карэспандэнты «Звязды» вырашылі праверыць, ці лёгка сёння незнаёмцу прабрацца ў чужое жыллё.

«Але ж яна ведае, як мяне завуць!»

— На «справу» выходзім каля трох гадзін дня. Бабулі раніцай збегаюць на рынак, на лаўцы пасядзяць, папляткараць — і да гэтага часу якраз будуць дома, — праводзіць невялічкі інструктаж **Алег КАХАВЕЦ, участковы інспектар Цэнтральнага РУУС г. Мінска.** — Да таго ж, як паказвае практыка, злачынствы часцей за ўсё здараюцца днём. Актыўная частка насельніцтва на працы, дома застаюцца толькі дзеці і пажылыя людзі, з якімі махлярам справіцца лёгка.

Алег Віктаравіч працуе ўчасковым два гады, але, як кажа малады спецыяліст, за гэты нядоўгі час ужо добра вывучыў сваіх «праблематычных падапечных». Ганна Іванаўна з 43-й кватэры, напрыклад, заўсёды забывае замыкаць дзверы, Ніна Рыгораўна, якая жыве на паверх ніжэй, ніколі не пытае, хто звоніць у дамафон, і адчыняе практычна ўсім, Галіна Мікалаеўна з дома насупраць наогул гатовая ўпусціць кожнага, абы з кім-небудзь пагаварыць.

Не перашкодзіла нам пранікнуць у жыллё нават унучка, якая, на жаль, і пусціла нас у кватэру без лішніх пытанняў.

— А вас «вашы» пенсіянеры ведаюць? Мабыць, пазнаюць па голасе? — пытаюся я ў нашага суправаджальніка па дарозе да дома, дзе жыве наша першая «ахвяра» з загадзя падрыхтаванага спіса.

— Знаёмы мы з усімі. Прафілактычныя гутаркі праводзім рэгулярна. З кімсьці сустракаемся вельмі часта. Ірына Пятроўна, да якой мы зараз ідзём, летась выклікала мяне на дапамогу амаль кожны дзень: дачка надумала кватэру дзяліць. Крыкі, сваркі, скандалы. З аднаго боку, справа сямейная, чаго лезці? А з другога — родныя з роднымі так не абыходзяцца, — узгадвае Алег Кахавец.

Ірына Пятроўна — інвалід з дзяцінства. На вуліцу жанчына выходзіць рэдка. Пастаяннымі і амаль што адзінымі суразмоўцамі пенсіянеркі з'яўляюцца ўчасковы тэрапеўт і дванаццацігадовы ўнук. Апошні, на шчасце, ставіцца да бабулі больш паважліва, чым яго маці.

— Ірына Пятроўна, добры дзень! Гэта ваш участковы тэрапеўт з паліклінікі, маё прозвішча Вераб'ёва, — кажу мілым голасам у дамафон. — Прыйшла праверыць, як вы сябе адчуваеце. Ціск не скача? — клапатліва працягваю я.

— Вітаю! Заходзьце, дарагая, калі ласка, — чуецца ў адказ.

Паднімаемся на шосты паверх. Дзверы ўжо адчынілі. Мы з фотакарэспандэнтам праходзім у кватэру і сутыкаемся з тым самым унукам, пра якога чулі раней ад Алега Віктаравіча. Ні хлопца, ні пенсіянерку не збянтэжыў той факт, што я не адна.

— Праходзьце, — паказваючы на пакой, кажа Ірына Пятроўна, — абутак можаце не здымаць.

У гэтую хвіліну да нас далучыўся ўчастковы, і на твары жанчына з'явілася пытанне: «Што здарылася? Зноў дачка?» Думкі пра тое, што ў яе на парозе стаіць парачка злодзеяў, нават не ўзнікла.

— Ірына Пятроўна, паважаная, мы колькі разоў з вамі гаварылі: нельга адчыняць дзверы кожнаму стрэчнаму! — кажа Алег Кахавец.

— Але ж яна не кожная, — гледзячы на мяне, спрабуе апраўдацца пенсіянерка. — Яна ведае, як мяне завуць, назвала нумар паліклінікі.

— А пасведчанне медыцынскага супрацоўніка вы спыталі? — не супакойваецца ўчастковы. — Увогуле, вы ж памятаеце, што да вас урач прыходзіць толькі тады, калі вы яго самі выклікаеце!

Пенсіянерка апусціла галаву, нібы першакласніца, якая атрымала двойку па матэматыцы. Праз хвіліну жанчына пачала прапаноўваць каву, гарбату, але страх і неразуменне ў вачах не знікалі: замест нас маглі прыйсці сапраўдныя ашуканцы.

— І часта вось так нас, старых, дураць? — раптам запыталася Ірына Пятроўна. — І што тут у мяне браць? Хіба толькі Васю, — паказваючы на вялікага сытага ката, кажа «пацярпелая».

Алег Кахавец патлумачыў, што зламыснікі заўсёды знойдуць, што і дзе ўзяць. Часцей за ўсё ашуканцы працуюць у парах, вось як мы з фотакарэспандэнтам. Пакуль адзін адцягвае ўвагу ветлівай гаспадыні, другі бярэ ўсё, што дрэнна ляжыць.

Навязванне непатрэбных лекаў — яшчэ адзін добры спосаб, абдурыць пажылых людзей. Як кажа Алег Віктаравіч, чалавек звычайна прадстаўляецца ўрачом паліклінікі, дзе абслугоўваецца абанент, і дэманструе поўную дасведчанасць аб стане яго здароўя. Ашуканец паведамляе, што пенсіянеру неабходна прайсці курс лячэння новымі прэпаратамі. Як правіла, прапануюць БАДы ці якую-небудзь падробку.

«Калі падарунак, тады заходзьце!»

Наступную нашу «ахвяру» звалі Кацярына Пілі́паўна. Жанчына жыве адна, але да яе часта прыходзяць дзеці, унукі. Дарэчы, пра апошніх. Сёння стала папулярнай такая схема падману пенсіянераў, калі на мабільны тэлефон паступае SMS-паведамленне нібыта ад родных з просьбай неадкладна пералічыць на названы нумар кругленькую суму. Маўляў, «трапіў у бяду, трэба вельмі тэрмінова». Ці, як варыянт, тэлефануе быццам «сябар» і паведамляе, што «ваш сын ці ўнук трапіў у ДТЗ (або ў п'яную бойку), і, каб не распачалі крымінальную справу, тэрмінова патрэбны грошы». Абаненту прапануюць падрыхтаваць грошы і перадаць чалавеку, які прыйдзе за імі праз гадзіну.

— У такой сітуацыі галоўнае — не панікаваць, а паспрабаваць датэлефанавацца да сваякоў, якія нібыта трапілі ў бяду, да іх сяброў ці калег. Трэба, каб аб дапамозе, калі яна сапраўды патрабуецца, прасіў блізкі чалавек, а не незнаёмы. Увогуле, каб пазбегнуць падобных сітуацый, маладым членам сям'і трэба абмеркаваць магчымы алгарытм дзеянняў з пенсіянерамі, — каментуе Алег Кахавец.

Да Кацярыны Пілі́паўны мы вырашылі прыйсці ў «вобразе» паштальёнаў. Пазванілі ў дамафон, і дзверы, на здзіўленне, нам адчынілі адразу, без пытанняў. Паднімаемся на трэці паверх. Пенсіянерка сустракае нас каля ліфта.

— Кацярына Пілі́паўна, я паштальён. Прынесла дабаўку да пенсіі, — звяртаюся да «ахвяры».

— Пенсію я атрымліваю ў канцы месяца. Нешта вы набыталі! — хутка адказвае жанчына.

— Гэта ж дабаўка да пенсіі. Падарунак да свята, — працягваю я.

— Калі падарунак, тады праходзьце, — чую ў адказ. — Так многа грошай далі, што вы ўдваіх іх прынеслі? — заўважаючы побач са мною фотакарэспандэнта, кажа Кацярына Пілі́паўна. — Ці гэта кавалер твой, страхуе? — смяецца жанчына.

А вось нам было не да смеху. На пытанне, чаму жанчына не пацікавілася па дамафоне, хто і навошта прыйшоў, Кацярына Пілі́паўна адказала, што чакала ўнучку, і думала, што гэта яна.

— Навошта ж вы мяне так падводзіце, — з'яўляецца Алег Кахавец. — Зноў на тыя ж граблі. Быў у вас учора, памятаеце? Пра што мы гаварылі?

Пенсіянерка пачала расказваць, што вочы ў мяне добрыя, голас прыемны і ўсмешка сапраўдная. Не магу я быць падманшчыцай! Адчувае яна дрэнных людзей! Дарэчы, зламыснікі любяць браць да сябе ў каманду жанчын. Маўляў, давер выклікаюць. Так, у кастрычніку 86-гадовы жыхар Лунінца аддаў шаснаццаць мільёнаў жанчыне, якая прадставілася супрацоўніцай выканкама і паведаміла, што хутка будуць мяняць грошы на купюры новага ўзору. Ашуканка прапанавала сваю дапамогу ў абмене. Яе ўдалося хутка затрымаць.

«Сантэхнікі так не размаўляюць!»

Да наступнай патэнцыйнай «пацярпелай» Алег Віктаравіч ішоў вельмі ўпэўнена. «З Марыяй Аляксандраўнай ваш нумар не пройдзе! Прадстаўляйцеся кім заўгодна — дзверы вам не адчыняць». На гэты раз галоўную ролю ў тэатры двух акцёраў я перадала свайму калегу. Сяргей з сваім гучным мужчынскім голасам іграў супрацоўніка ЖЭСа.

— Добры дзень. Вас з ЖЭСа турбуюць. Да нас паведамленне прыйшло, што ў вашым доме прарвала трубу стаяка. Мне б падняцца, паглядзець, што і як там, праверыць, — кажа ў дамафон фотакарэспандэнт.

— А вы хто? Як вас завуць? Я ўсіх нашых сантэхнікаў ведаю! — чуем у адказ.

— Я малады спецыяліст, працую першы месяц. Марыя Аляксандраўна, так адчыніце ці не? Мне працаваць трэба! — не супакойваецца Сяргей.

— Мяне ніхто пра ваш візіт не папярэджваў! І ўвогуле, ведаю я вас: прыйдзеце ў брудным абутку, потым месяц ад вашай працы адмывайся. Я, між іншым, тыдзень назад рамонт у ванным пакоі зрабіла, — пайшла ў абарону пенсіянерка.

— Дык нам няцяжка разуцца! — працягвае фотакарэспандэнт.

— Каму гэта нам?! Вы не адзін? Не, дзверы я вам не адчыню. Да пабачэння! — адрэзала жанчына.

Участковы набраў па дамафоне нумар кватэры Марыі Аляксандраўны яшчэ раз, прадставіўся, і мы зайшлі ў пад'езд. У ліфце Алег Віктаравіч распавёў, што гаспадыня кватэры №57 — міравая жанчына. Працавала ў двух міністэрствах, мае камандны голас і цяпер ва ўсім доме падтрымлівае дысцыпліну.

— Марыя Аляксандраўна, дарагая, дзякуй, што не падвялі мяне! У вас я быў упэўнены на сто працэнтаў, — пачаў Алег Кахавец адразу, як толькі мы пераступілі парог кватэры «міравой жанчыны».

— А чаму вы мне не адчынілі? Што вас збянтэжыла? Мабыць, я нешта не так сказаў? — пачаў цікавіцца няўдалы супрацоўнік ЖЭСа.

— Наадварот! Вельмі вы інтэлігентна, спакойна і правільна гаварылі. Не размаўляюць так сантэхнікі! Тыя заўсёды нешта незразумелае буркаюць, ледзь языком варочаючы, — раскрывае ўсе сакрэты пенсіянерка.

Дарэчы, пра ўсе планавыя праверкі ЖЭСы паведамляюць загадзя. Такое папярэджанне можна прачытаць на дошцы інфармацыі каля вашага пад'езда або самому патэлефанаваць у патрэбны ЖЭС і ўдакладніць пра рамонтныя работы і наяўнасць такога супрацоўніка ў іх штаце.

Марыя Аляксандраўна праводзіла нас да дзвярэй і параіла зайсці ў суседнюю кватэру. Там, па словах жанчыны, жыве пажылая пара з унучкай. «Яны дакладна адчыняць! Не будуць дапытвацца, хто вы такія».

Падчас нашай праверкі знайшлася і пільная пенсіянерка, якая, нягледзячы на ўгаворы, не адчыніла дзвярэй незнаёмцам.

Націскаем званок. Прадстаўляемся ўсё тымі ж сантэхнікамі, і нас пускаюць у жыллё. На гэты раз мы з фотакарэспандэнтам вырашылі пайсці далей: паспрабаваць паасобку пранікнуць у розныя пакоі. Усё атрымалася. Не перашкодзіла нам гэта зрабіць нават унучка, якая, на жаль, і пусціла нас у кватэру без лішніх пытанняў. Вось і выходзіць, што не ратуюць пенсіянераў ад ашуканцаў нават маладыя. Карціна ўсё такая ж.

— Вераніка, а чаму вы нават не паглядзелі, ці ёсць у нас якія інструменты? Не звярнулі ўвагу на тое, што мы ў джынсах і куртках замест спецвопраткі? — пытаюся я ў разгубленай унучкі.

Дзяўчына ў адказ толькі паціскала плячыма. Напэўна, гэта даверлівасць. Даверлівасць, якая характэрна як старым, так і дваццацігадовым. Так, у пачатку лістапада 86-гадовая жыхарка вёскі Купяцічы Пінскага раёна па дабрыні сваёй душэўнай сама пусціла ў хату дзвюх ашуканак. Жанчыны прадставіліся сацыяльнымі работнікамі і сказалі, што ім неабходна перапісаць нумары грашовых купюр для абмену. Пенсіянерка паверыла гасцям і прынесла каля 1 мільёна рублёў. Пакуль адна стварала бачнасць фіксацыі банкнот, другая паведаміла гаспадыні, што за бюджэтныя сродкі ў яе доме плануецца выканаць рамонт. Падманшчыца прапанавала агледзець дом і вызначыцца, колькі шпалер трэба для яго выканання. Пасля гаспадыня расказала аб гэтым візіце свайму сыну. Той растлумачыў, што ў перапісе нумароў купюр няма неабходнасці, і параіў ёй праверыць наяўнасць усёй сумы грошай. Як аказалася, сума зменшылася на 400 тысяч беларускіх рублёў. На жаль, зладзеек пакуль затрымаць не ўдалося.

— Звычайна такія справы раскрыць цяжка. Пенсіянеры не запамінаюць, як выглядалі ашуканцы. Пытаць аб прыкладным узросце, колеры і даўжыні валасоў, прыкметах бессэнсоўна. Вось і атрымліваецца, што інфармацыі пра злачынцаў вельмі мала, — гаворыць Алег Віктаравіч.

Ідучы дадому, мы з фотакарэспандэнтам падвялі вынікі: з чатырох кватэр нас пусцілі ў тры. Напэўна, калі б наша праверка прадоўжылася, патэнцыйнай ахвярай стаў бы яшчэ не адзін пенсіянер. У гэтай справе, як высветлілася, не абавязкова мець вопыт працы ў ЖЭСе, ведаць усе асаблівасці прафесіі паштальёна ці валодаць таварыскасцю і кемлівасцю ката Базіліа і лісы Алісы. Людзі, на жаль, самі без лішніх пытанняў пускаюць злачынцаў у свой дом.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Часцей за ўсё пенсіянеры не запамінаюць, як выглядалі ашуканцы. Раскрыць такія справы становіцца яшчэ складаней.